ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (855) ● ● Чацвер, 22 чэрвеня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

У ПАРТКОМЕ

## ЦЯПЕР — АБ НОВЫМ ГОДЗЕ

Завяршаецца навучальны год. І ўжо цяпер, не адкладваючы да восені, патрэбна паклапаціцца аб узорнай падрыхтоўцы да новага навучальнага года. Таму невыпадкова на чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта галоўным было пытанне аб рабоце гаспадарчай часткі па падрыхтоўцы да новага навучальнага года. З дакладам выступіў прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце П. П. Леўчэнка. Ён паведаміў аб тым, што ўсе вучэбныя карпусы адрамантаваны. Засталося толькі прывесці ў належны парадак аўдыторыі, якія вызвалены ў сувязі з пераездам інстытута прыкладных фізічных праблем. Некаторыя работы прадстаіць зрабіць у хімічным корпусе і на геафаку, добраўпарадкаваць двор філфака і тэрыторыю каля інтэрнатаў № 4 і № 5.

Падрыхтаваны да прыёму абітурыентаў і студэнтаў інтэрнаты.

У асноўным гатовы прадпрыемствы грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання. Аднак неабходна расшырыць сталовую ў корпусе хімічнага факультэта і адкрыць буфеты на 25 месц на геафаку і ў юрыдычным корпусе. Павялічыцца плошча буфета да 60 месц на фізфаку, адкрыецца вялікі буфет у інтэрнаце № 7.

Цяпер, як паведаміў т. Леўчанка, выконваюцца заяўкі факультэтаў на абсталяванне і апаратуру. На чарзе—рамонт аўдыторных дошак, мэблі ў вучэбных карпусах і інтэрнатах.

У час абмеркавання даклада члены партыйнага камітэта ўнеслі шэраг слушных прапаноў, выказалі канкрэтныя заўвагі.

У прынятай пастанове партыйны камітэт абавязаў т. Леўчанку забяспечыць выкананне ва ўстаноўлены тэрмін усіх рамонтных работ і набыццё неабходнай колькасці мэблі і абсталявання.

Партыйнай арганізацыі АГЧ прапанавана ўсямерна садзейнічаць лепшай падрыхтоўцы матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта да пачатку заняткаў.



*НА ЗДЫМКУ: тэхнік кафедры аналітычнай хіміі — студэнтка-вячэрніца II курса хімфака — Т. К. Халецкая выконвае заказ Салігорскага калійнага камбіната — распрацоўвае методыку вызначэння амінаў у солях.*

Фота *Д. Чаховіча.*

## МІЖНАРОДНЫ СІМПОЗІУМ

**27 чэрвеня ва універсітэце адкрываецца міжнародны сімпозіум «Роля рускай і савецкай літаратуры ў выкладанні рускай мовы як замежнай».**

**У Мінск прыедуць вучоныя з Балгарыі, ГДР, Польшчы, Чэхаславакіі, Румыніі, Францыі, Велікабрытаніі, Італіі і Швецыі. У рабоце секцый прымуць удзел вядомыя савецкія літаратуразнаўцы і выкладчыкі філалагічнага факультэта нашага універсітэта.**

**Сімпозіум працягнецца да 29 чэрвеня.**

**Л. АРЛОВА.**

## ГАТОВЫ ДА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

Заканчваецца падрыхтоўчы перыяд арганізацыі студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Як жа прайшоў яго заключны этап? Арганізаваны 54 студэнцкія будаўнічыя атрады. Два з іх будуць працаваць у Томскай вобласці, 10 — у Казахстане, 9 — у Мінску, тры—у Гомельскай вобласці, у Акцябрскім раёне, адзін—на рэстаўрацыі Брэсцкай крэпасці-героя, два—у Віцебскай вобласці, 24 — у Мінскай вобласці, адзін—атрад мінскага рэзерву праваднікоў, адзін — у ГДР і адзін — упершыню ў НРБ.

Падведзены вынікі падрыхтоўчага перыяду. Сярод факультэтаў першае месца заняў фізічны, другое—юрыдычны, трэцяе — гістарычны. Сярод лепшых трэба адзначыць атрады «Цаліны» (камандзір А. Савайтан) і «Вікторыя» (камандзір У. Рассохін) гістарычнага факультэта, «Буравеснік-72» (камандзір Л. Агароднік) філалагічнага факультэта, «Імпульс» (камандзір Л. Семяненка), «Спектр» (камандзір А. Майонаў), «Салярыс» (камандзір Жылко) фізічнага факультэта, «Феміда» юрыдычнага факультэта і іншыя. На працягу падрыхтоўчага перыяду СБА прайшлі тры этапы медагляду, прайшлі свае школы камандзіры і камісары.

У гэтым працоўным семестры ў студэнцкім будаўнічым руху ва універсітэце будуць удзельнічаць каля 1900 чалавек.

Добра папрацавалі камандзіры, камісары, байцы СБА. Думаецца, што працоўны семестр універсітэцкіх будаўнічых атрадаў пройдзе на высокім узроўні.

**А. АДАМУШКА,**
**начальнік штаба працоўных спраў БДУ.**

## КАБ ДОБРА ПРАЙШЛА СЕСІЯ

Ідуць апошнія экзамены ў студэнтаў стацыянара. Хутка аўдыторыі і вучэбныя кабінеты зоймуць завочнікі. Але ўжо і зараз на завочным факультэце шмат турбот: ідзе абарона дыпломных работ і здача дзяржаўных экзаменаў. Паспяхова трымаюць апошнія студэнцкія выпрабаванні біёлагі і гісторыкі.

Вельмі добрыя дыпломныя работы падрыхтавалі некаторыя выпускнікі біялагічнага аддзялення. Плённа працавалі завочнікі на кафедрах біяхіміі, фізіялогіі чалавека і жывёл і іншых. Многія з іх нават паспяхова ўдзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых работ.

Пачалася летняя сесія таксама ў географаў, юрыстаў і матэматыкаў. Што ж зроблена, каб прайшла яна добра, без зрываў?

— Каб паменшыць нагрузку ў час сесіі, — расказвае намеснік дэкана М. М. Драко, — у нас састаўлен расклад здачы некаторых экзаменаў у межсесійны перыяд. Усім студэнтам былі своечасова пасланы выклікі на сесію, зараз наладжаны рэгулярныя кансультацыі.

Гэта арганізацыйны момант, а астатняе залежыць ад саміх студэнтаў, ад іх падрыхтоўкі, добрасумленнасці. Аднак, вось студэнтам-географам у гэтым сэнсе чагосьці і не хапіла. На стале тры ведамасці здачы экзаменаў на IV курсе геаграфічнага аддзялення. Экзамен па палітычнай эканоміі ў адной з груп у 35 чалавек прайшоў з такім вынікам: 9 чалавек атрымалі «добра», астатнія—«здавальняюча». Але ў той жа самай групе на экзамене па эканамічнай геаграфіі капіталістычных краін 8 выдатных адзнак і толькі 10 здавальняючых. У фізгеографаў па гідрагеалогіі атрымана 11 пасрэдных адзнак.

Прычын такіх скачкоў называюць шмат, але, на наш погляд, усё залежыць ад адносін да прадмета, працаздольнасці студэнта.

**Л. ДРУЗЕВА.**



**На здымках:** ідзе экзамен па мікрабіялогіі ў студэнтаў трэцяга курса аддзялення біялогіі завочнага факультэта. Перад экзаменатарам дацэнтам **В. І. Калешка** настаўніца Ражанкоўскай СШ Гродзенскай вобласці **А. Т. Хоміч.**

Фота **Д. Чаховіча.**





## НА СУСТРЭЧУ З МІНУЛЫМ

150 студэнтаў першага і другога курсаў гістарычнага факультэта паедуць сёлета на археалагічную практыку ў г. п. Копыль Віцебскай вобласці. Асноўная мэта практыкі: пазнаёміць студэнтаў з метадамі раскопак і апрацоўкі археалагічных матэрыялаў.

Вось ужо многа год нязменны кіраўнік летняй практыкі— дацэнт Эдуард Міхайлавіч Загарульскі. Ён расказвае:

— Раскопкі будуць весціся на гарадзішчы старажытнарускай крэпасці, якая ўпамінаецца ў летапісу XI стагоддзя. Горад — равеснік Мінска. Таму вельмі цікава, і гэта складае нашу асноўную навуковую мэту, супаставіць матэрыяльную культуру ранняй Копысі і Мінска. У гэтым годзе мы пачынаем упершыню вялікія, разлічаныя на шмат год, раскопкі. Так што практыка абяцае быць цікавай і плённай.

**М. МАЦЕЙКА.**

# ЛЕТА КЛІЧА Ў ДАРОГУ

За вокнамі стаіць гарачае лета. Яно так і вабіць у нязведаныя далі, кліча на шырокі прастор лясных абшараў, на мурожныя берагі рэк і азёраў. Але пакуль усе думкі студэнтаў аб экзаменах. Сесія падыходзіць к канцу, і трэба каб яна завяршылася паспяхова.

Сёлетні год своеасаблівы. Усе народы нашай краіны і прагрэсіўнае чалавецтва свету рыхтуюцца адзначыць слаўнае 50-годдзе ўтварэння СССР. Выдатнымі поспехамі ў вучобе хочуць сустрэць вялікае свята і прадстаўнікі замежных краін — студэнты БДУ.

На падрыхтоўчым факультэце сёлета вучыцца дружная сям'я студэнтаў з 8 краін свету. Усе яны дапамагаюць адзін аднаму авалодваць ведамі. І зараз, здаючы экзамены, цікавяцца поспехамі, раяцца, а часам і спрачаюцца па тых ці іншых пытаннях.

На факультэце рыхтуецца чарговы, адзінаццаты выпуск замежных студэнтаў. Праз два месяцы яны раз'едуцца па розных навучальных установах. А пакуль... сесія! Своеасаблівым для іх быў залік па курсу «Савецкі Саюз». Вывучаючы гэты прадмет, студэнты бліжэй пазнаёміліся з нашай краінай, з яе багатым мінулым і цікавым сённяшнім днём. І прыемна было пачуць, з якім захапленнем студэнты расказвалі аб Краіне Саветаў, аб дружнай сям'і яе народаў, аб мужнай барацьбе ў гады цяжкіх выпрабаванняў.

Здаючы экзамены па рускай мове, студэнты расказваюць аб легендарных абаронцах Брэсцкай крэпасці, аб савецкіх наватарах і перадавіках вытворчасці, аб нястомных барацьбітах міжнароднага рабочага руху.

На экзаменах па фізіцы, матэматыцы, хіміі студэнты ўмела арыентуюцца і пры адказе на дадатковыя пытанні.

Многія закончылі навучальны год на добра і выдатна.

Найлепшых вынікаў дабіліся студэнты: Інасенціа Лімонта, Фабрыцыа Лінарэс, Хасэ Эрнандэс (Куба); Ле Т'і Зунг, Нгуен Кхак Хунг, Данг Тунг Ман, Нгуен Фі (ДРВ); Гатсона Базіль (Конга); Махамедзі Амезіян (Алжыр); Мошэ Аўгусцін, Рогатэ Мунісі (Танзанія); Фафана Алхазіс (Сьера-Леоне) і іншыя.

Неўзабаве апошні экзамен. І студэнцкае жыццё напоўніцца новымі клопатамі. У першыя дні ліпеня замежныя студэнты пойдуць працаваць у гарадскі трэст зялёнага будаўніцтва. Тут яны будуць даглядаць кветкі, дэкаратыўныя дрэвы і кусты. Заробленыя грошы студэнты адправяць у фонд дапамогі мужным патрыётам В'етнама.

А там недалёка і час адпачынку. Сёлета, як і заўсёды, студэнты будуць адпачываць у спартыўным лагеры на маляўнічым беразе сінявокай Нарачы. Некаторыя з іх паедуць у аўтапаездзе «Дружба» па Беларусі і Літве, каб убачыць сваімі вачыма велічны росквіт савецкай зямлі, пазнаёміцца з яе слаўнымі працаўнікамі.

Лета кліча ў дарогу!

**В. КАЛАДЗІНСКІ.**

## ЧАС ДАРАЖЭЙ ЗА ЗОЛАТА

Закончыўся наш першы год вучобы ў СССР. Зараз мы здаём экзамены, якія з'яўляюцца сур'ёзнай праверкай нашай работы.

Хто са студэнтаў не марыць здаць экзамены на добра і выдатна! Але мала толькі марыць. Каб гэта мара ажыццявілася, трэба яшчэ многа і упарта папрацаваць перад экзаменамі.

Па-рознаму мы адносіліся да вучобы. Былі сярод нас студэнты, якія з першых і да апошніх дзён навучальнага года займаліся сістэматычна і сур'ёзна. Думаем, яны паспяхова здадуць экзамены. А некаторыя вучыліся не заўсёды добрасумленна. Ім, вядома, цяжэй рыхтавацца да экзаменаў і здаваць іх. Толькі цяпер яны пачалі займацца настойліва: паўтараюць кожную лекцыю, кожны тэкст. Хочацца спадзявацца, што яны адолеюць цяжкасці.

Дарагія сябры, час зараз даражэй за золата! Нельга траціць ніводнай мінуты. Прыклаўшы ўсе намаганні, мы павінны паспяхова завяршыць навучанне на падрыхтоўчым факультэце.

Жадаю ўсім студэнтам універсітэта поспехаў на экзаменах.

**ЗЫОНГ ХОА БІНЬ, студэнт 9-й групы.**





Нядаўна ва універсітэце абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук аспірант з НРБ Іардан Дзімітроў. У гутарцы з нашым карэспандэнтам ён заявіў, што на працягу ўсіх год вучобы ён адчуваў вялікую падтрымку і ўвагу з боку ўсіх супрацоўнікаў матэматычнага факультэта і асабліва навуковага кіраўніка прафесара Р. Ф. Габасава. Ён выказаў вялікую ўдзячнасць кіраўніцтву універсітэта і дэкану К. К. Герману за ўсе клопаты аб ім.

Фота Д. Чаховіча.

# СССР 50 БЕЛАРУСКАЯ ССР—АДНА З ЗАСНАВАЛЬНІЦ САЮЗА ССР

**У сувязі з юбілеем нашай краіны ў выдавецтве БДУ рыхтуецца да выпуску кніга прафесара М. Я. ШКЛЯРА «Беларуская ССР—адна з заснавальніц Саюза ССР». Сёння мы прапануем увазе чытачоў урывак з гэтай кнігі.**

К 1922 г. былі створаны неабходныя эканамічныя і палітычныя ўмовы для ўтварэння сацыялістычнай мнагацыянальнай дзяржавы. Падрыхтоўкай утварэння СССР кіравалі Камуністычная партыя, У. І. Ленін. Партыя звязвала аб'яднанне народаў у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з барацьбой за пабудову сацыялізму і камунізму, разглядаючы задачу згуртавання народаў як частку агульнай задачы пабудовы камунізму. Камуністычная партыя абапіралася на аналіз глыбокіх аб'ектыўных прычын, якія ляжалі ў аснове ўтварэння СССР.

«Мы хочам добраахвотнага саюза нацый,—вучыў У. І. Ленін,— такога саюза, які не дапускаў бы ніякага насілля адной нацыі над другой, — такога саюза, які быў бы заснаван на паўнейшым давер'і, на ясным усведамленні брацкага адзінства, на ўпаўне добраахвотнай згодзе. Такі саюз нельга здзейсніць адразу; да яго трэба дапрацавацца з вялікай цярплівасцю і асцярожнасцю...»

Аб'яднанне Савецкіх рэспублік у адзіны дзяржаўны саюз адпавядала жыццёвым інтарэсам рабочых, працоўных сялян Савецкай краіны. Разам з тым утварэнне саюза рэспублік з'яўлялася вынікам распачатага пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі працэсу складвання і фарміравання сацыялістычных нацый пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, якая замацоўвала новыя нацыі і кіравала імі.

У жніўні 1922 г. Аргбюро ЦК РКП(б) утварыла камісію для падрыхтоўкі праекта рашэння аб узаемаадносінах паміж РСФСР і незалежнымі Савецкімі рэспублікамі, куды ўвайшлі прадстаўнікі ЦК РКП(б), ЦК Кампартыі Украіны, Беларусі, Арменіі, Грузіі, Азербайджана, Далёкаўсходняй рэспублікі, Бухары і Харэзма. Праект з'яўляўся прадметам абмеркавання ў цэнтральных, савецкіх і партыйных органах рэспублік.

Аргбюро ЦК РКП(б), якое засядала 23—24 верасня 1922 г., прыняло праект «аўтанамізацыі» за аснову. Усе матэрыялы камісіі былі накіраваны У. І. Леніну, які ў гэты час знаходзіўся ў Горках пасля хваробы і таму не мог удзельнічаць у абмеркаванні праблемы ўтварэння СССР. 26 верасня У. І. Ленін напісаў пісьмо членам Палітбюро ЦК РКП(б), у якім указаў, што аб'яднанне рэспублік — архіважнае пытанне, пры якім недапушчальна паспешлівасць. Ён прапанаваў прынцыпова новую аснову ўтварэння саюзнай дзяржавы—добраахвотнае аб'яднанне незалежных рэспублік, у тым ліку РСФСР у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з захаваннем раўнапраўя за кожнай з іх. У. І. Ленін пісаў, што мы— РСФСР «прызнаём сябе раўнапраўнымі з Украінскай ССР і іншымі і разам і нароўні з імі ўваходзім у новы саюз, новую федэрацыю».

У. І. Ленін прапанаваў стварыць агульнафедэральны УЦВК Саюза Саврэспублік, а не падпарадкоўваць рэспублікі цэнтральным органам РСФСР. Такім чынам, новая форма дзяржаўнага аб'яднання Савецкіх рэспублік на роўных правах у адзіны дзяржаўны саюз была адкрыта У. І. Леніным.

Прайшоўшы 6 кастрычніка 1922 г. Пленум ЦК РКП(б) абмеркаваў і аднадушна прыняў рашэнне аб форме дзяржаўнага аб'яднання Савецкіх рэспублік у саставе мнoганацыянальнай дзяржавы. У рашэннях Пленума гаварылася аб неабходнасці заключэння дагавору паміж Украінай, Беларуссю, Федэрацыяй Закаўказскіх рэспублік і РСФСР аб аб'яднанні іх у Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і з захаваннем за кожнай з іх права свабоднага выхаду з саставу Саюза. Пленум выбраў камісію для распрацоўкі канстытуцыйных асноў Саюза ССР.

Пытанне аб утварэнні СССР было пастаўлена на абмеркаванне ў саюзных рэспубліках. Кампартыі Украіны, Беларусі і іншых рэспублік адобрылі рашэнні кастрычніцкага Пленума ЦК РКП(б). У гэты час Кампартыя Беларусі ўзмацніла прапаганду ідэй дружбы народаў і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму. У БССР адбыліся з'езды Саветаў, на якіх абмяркоўваліся пытанні ўтварэння СССР.

10 снежня 1922 г. у памяшканні Мінскага гарадскога тэатра адбылася шырокая канферэнцыя рабочых і служачых горада, на якой было разгледжана пытанне аб задачах IV з'езда Саветаў Беларусі. Канферэнцыя выказала ўпэўненасць, што IV з'езд Саветаў Беларусі прыме рашэнне аб неабходнасці ўтварэння СССР. Яна таксама адзначыла, што ўся работа Савецкай Беларусі да цяперашняга часу мела станоўчае значэнне дзякуючы цеснай сувязі яе з усімі рэспублікамі, асабліва з РСФСР. 14 снежня 1922 г. пленарнае пасяджэнне Мінскага Савета прыняло «Наказ» IV з'езду Саветаў Беларусі, у якім указвалася, што з'езд Саветаў павінен прыняць рашэнне аб неабходнасці ўтварэння СССР.

14 снежня 1922 г. у Мінску адкрыўся IV з'езд Саветаў Беларусі. У першы дзень работы з'езд прыняў зварот да ўсіх працоўных, у якім падкрэслівалася, што Савецкая Беларусь заўсёды ішла ў нагу з усімі Савецкімі рэспублікамі. З'езд паслаў прывітальную тэлеграму РСФСР, УССР і ЗСФСР. У ёй гаварылася, што Усебеларускі з'езд Саветаў у дзень пачатку сваёй работы пасылае брацкае прывітанне рабочым і сялянам братніх саюзных рэспублік.

IV з'езд Саветаў Беларусі аднадушна прыняў дэкларацыю аб неабходнасці ўтварэння Саюза ССР. У ёй гаварылася, што гэты саюз замацаваўся крывёй дзесяткаў мільёнаў рабочых і сялян Беларусі, Украіны, Закаўказскіх рэспублік на ўсіх франтах барацьбы з унутранай контррэвалюцыяй і замежнымі інтэрвентамі.

IV Усебеларускі з'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў адзначыў, што прапанова Усеукраінскага з'езда Саветаў аб неадкладным афармленні ўжо фактычна існуючага Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік адпавядае жыццёвым інтарэсам Савецкай Беларусі і таму павінна атрымаць хутчэйшае здзяйсненне на прадстаячым з'ездзе Саветаў усіх Савецкіх рэспублік.

З'езд Саветаў Беларусі выказаў глыбокую ўпэўненасць, што з'езд РСФСР сумесна з прадстаўнікамі Украіны, Беларусі і Закаўказскіх рэспублік створыць адзіны, моцна згуртаваны саюз працоўных усіх брацкіх рэспублік. З'езд даручыў «сваёй дэлегацыі, выбіраемай для ўдзелу ва Усерасійскім з'ездзе Саветаў, даць у час работы з'езда ўрачыстае абяцанне і зрабіць фармальныя акты, якія замацоўваюць брацкі Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік». З'езд выбраў прадстаўнікоў на X з'езд Саветаў РСФСР і I Усесаюзны з'езд Саветаў.

Абмеркаванне на IV з'ездзе Саветаў пытання аб утварэнні СССР ператварылася ў грандыёзную дэманстрацыю адзінства волі працоўных БССР і працоўных іншых рэспублік. Пастанову аб неабходнасці ўтварэння Савецкага Саюза прынялі VII Усеукраінскі, I Закаўказскі з'езды Саветаў.

29 снежня 1922 г. у Вялікім Крамлёўскім палацы адбылася канферэнцыя паўнамоцных дэлегацый усіх Савецкіх рэспублік. На парадак дня канферэнцыі былі пастаўлены два пытанні: разгляд Дэкларацыі і Саюзнага дагавору аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік; парадак работы і тэрмін адкрыцця I з'езда Саветаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

На канферэнцыі абмяркоўвалася таксама пытанне аб назве саюзнай дзяржавы. Было прапанавана называць новую дзяржаву Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Выступаючы за прыняцце гэтай прапановы, М. В. Фрунзе ўказаў, што гэтая назва, па-першае, адлюстроўвае суверэннасць і раўнапраўе кожнай з рэспублік, уступіўшых у састаў саюзнай дзяржавы, па-другое, падкрэслівае, што саюзная Савецкая дзяржава не ёсць нешта замкнутае і ізаляванае, што доступ у яе адкрыт новым членам. Канферэнцыя цалкам згадзілася з гэтымі довадамі і прыняла рашэнне назваць новую дзяржаву Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

30 снежня 1922 г. у Вялікім тэатры ў Маскве пачаў сваю работу I з'езд Саветаў Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. На ім прысутнічала 1.727 дэлегатаў РСФСР, 364 дэлегаты УССР, 91 дэлегат ЗСФСР і 33 дэлегаты БССР. З'езд разгледзеў два пытанні: зацвярджэнне Дэкларацыі аб утварэнні СССР і Саюзнага дагавору і выбары ЦВК СССР. Ганаровым старшынёй з'езда быў выбран У. І. Ленін.

I Усесаюзны з'езд Саветаў, які прайшоў пад знакам перамогі ленінскіх ідэй, прыняў Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні Саюза ССР і аб'яднаў у яго саставе чатыры брацкія рэспублікі — РСФСР, УССР, БССР, ЗСФСР. Савецкія рэспублікі на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя аб'ядналіся ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік з захаваннем за кожнай саюзнай рэспублікай суверэнных правоў самастойнай дзяржавы, маючай свае вышэйшыя органы ўлады, сваю тэрыторыю, сваю канстытуцыю, сваё заканадаўства.

З'езд выбраў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР. Старшынямі ЦВК былі выбраны М. І. Калінін, Г. І. Пятроўскі, А. Г. Чарвякоў, Н. Н. Нарыманаў.

# Да 90-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы

# ЯНКА КУПАЛА І БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ



Студзень 1919 года. Смаленск. Шумна і весела ў кватэры Луцэвічаў. Жаданы госць з Беларусі, Цішка Гартны, наведаў Янку Купалу. І, што самае галоўнае, ён прывёз радасную вестку аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Песняра, які так доўга марыў аб свабодзе і дзяржаўнасці Беларусі, гэта падзея ўзрушыла да глыбіні душы. З неадольнай сілай пацягнула на радзіму. «Я даўно чакаю таго дня, каб вярнуцца ў Беларусь,— усхвалявана гаворыць ён.— Мне хочацца хутчэй уключыцца ў літаратурную работу». Купала збіраўся нядоўга. Дваццаць першага студзеня ён ужо ў Мінску — і адразу ж з галавой акунаецца ў літаратурнае жыццё сталіцы. Ён піша вершы, вывучае славянскую міфалогію, завяршае пераклад «Слова аб палку Ігаравым». Але Купала не толькі літаратар. Ён актыўны грамадскі дзеяч. Будучы членам Наркамасветы БССР, паэт прымае актыўны ўдзел у стварэнні першых навуковых цэнтраў на Беларусі — Інбелкульта і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. І з гэтай пары, з дня ўрачыстага адкрыцця БДУ, якое адбылося 30 кастрычніка 1921 года, Купалу звязвае цесная дружба са студэнтамі і выкладчыкамі універсітэта. Ён перапісваецца з Ф. Ф. Туруком, выкладчыкам кафедры гісторыі Беларусі, з І. В. Кончарам, які вёў ва універсітэце семінар эканамічнай геаграфіі Расіі і Беларусі. Н. Н. Янчук, прафесар кафедры беларускай літаратуры і этнаграфіі ў БДУ, перакладае на рускую мову некалькі вершаў Купалы, у тым ліку і верш «Не гаснуць зоркі ў небе», які стаў своеасаблівым беларускім гімнам. 19 сакавіка 1922 года надзвычай мнагалюдна было ў актавай зале БДУ. Моладзь, выкладчыкі, пісьменнікі прыйшлі сюды, каб павіншаваць з 40-годдзем любімага паэта.

Урачыстае пасяджэнне адкрыў рэктар БДУ У. І. Пічэта. З дакладамі аб жыцці і творчасці Купалы выступілі М. Пятуховіч, У. Ігнатоўскі, А. Вазнясенскі, С. Кацэнбоген. Студэнт універсітэта Міхась Зарніца прачытаў свой верш «Вялікаму песняру Бацькаўшчыны». А потым, пасля ўсіх віншаванняў, пачынаецца самае галоўнае: Купала чытае свае вершы. Слухачам па душы кожнае яго слова — гэта баявы запал, імкненне наперад, да новых вяршынь. Выклікае сімпатыю і сам паэт, гарачы, імклівы, з маладым агеньчыкам у вачах.

40-годдзе становіцца і пераломным момантам у творчасці. У 1922 годзе Янка Купала выдае новы зборнік вершаў «Спадчына». «Зборнікам «Спадчына», — пісаў Я. Колас,— Купала завяршае свой паэтычны дакастрычніцкі шлях і становіцца на новы, на шлях палкага прыхільніка і песняра новай эпохі, пачатак якой паклала Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя». Вершы Купалы, як і само жыццё, набылі светлую афарбоўку. Матывы радаснага будаўніцтва гучаць у іх. А героі — сяляне, рабочыя, людзі мірнай і шчаслівай працы.

Як заслужаная ўзнагарода за сапраўды народныя творы ў чэрвені 1925 года Янку Купалу прысвоена званне народнага паэта Беларусі.

Кожны дзень паэта распісаны па хвілінах. Тут і творчыя паездкі, і сустрэчы, і пасяджэнні, а галоўнае — праца. Пісаў Купала ў той час вельмі многа. І ўсё ж ён знаходзіў час па запрашэнню студэнтаў прыйсці ва універсітэт, пацікавіцца іх жыццём, пачытаць новыя творы. І хто ведае, можа іменна тут, у віры жыцця і маладосці, паэт чэрпае тую радасць і баявы запал, якія потым выліваюцца ў вершах. Так, «7 сакавіка 1925 года на рабфаку БДУ адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны Я. Купалу і М. Чароту. Былі заслуханы чатыры даклады рабфакаўцаў аб Купале і Чароту і вершы, прысвечаныя ім. Я. Купала ў адказ прачытаў свае вершы»,—паведамляла «Савецкая Беларусь» 10 сакавіка. «22 лістапада таго ж года педфакаўцы універсітэта правялі вечар, прысвечаны 20-годдзю літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы. З дакладамі аб творчасці паэта выступілі М. Пятуховіч і А. Вазнясенскі. Юбіляра вітаў на ўкраінскай мове прафесар П. Бузук, які незадоўга перад гэтым прыехаў на пастаянную працу ў БДУ з Адэсы. Я. Купала чытаў свае вершы». 31 кастрычніка 1926 года Янка Купала разам з Якубам Коласам прысутнічаюць на ўрачыстым пасяджэнні БДУ, прысвечаным 25-годдзю навуковай дзейнасці рэктара універсітэта прафесара У. І. Пічэты.

Калі 15 сакавіка 1929 года праходзілі выбары ў гарадскі Савет, студэнты і выкладчыкі педфака БДУ не ваганіся, хто будзе іх дэпутатам: ну, вядома ж, народныя паэты Беларусі Янка Купала і Якуб Колас! З таго часу сувязь Купалы з універсітэтам, асабліва з педфакам, становіцца яшчэ больш моцнай.

1930 год. Беларускі народ урачыста адзначае 25-годдзе літаратурнай дзейнасці Купалы. 28 мая ў Доме асветы адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны паэту. Рэктар БДУ М. Пятуховіч выступіў з дакладам пра творчасць вялікага паэта. У сувязі з юбілеем НКА БССР устанавіў дзве стыпендыі імя Янкі Купалы — на літаратурным аддзяленні педфака БДУ і ў Мінскім белпедтэхнікуме.

23 красавіка 1933 года студэнты БДУ зноў вітаюць народнага песняра ў сценах сваёй «альма-матэр», на вечары, які адбыўся ў сувязі з гадавінай пастановы ЦК ВКП(б) «Аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый». Купала расказвае студэнтам аб тых дабратворных зменах, якія адбыліся ў выніку перабудовы, і, вядома, чытае новыя вершы.

Маладым літаратурным сілам універсітэта патрэбен мудры і вопытны настаўнік, які б правільна растлумачыў падзеі літаратурнага жыцця, падказаў, як пісаць, дапамог выправіць памылкі. Такім настаўнікам і быў для іх Купала. Як вялікі мастак, майстар паэтычнага слова, ён аказаў значны ўплыў на пачаткоўцаў.

Паэт працуе многа і плённа. У гэты час ён піша такія вядомыя вершы, як «На нашым полі», «Выпраўляла маці сына», «Алеся», «Лён», паэму «Над ракой Арэсай». Будучае моладзі паўстае перад Купалам у яркім святле. Верай у маладыя сілы прасякнут верш «Наша моладзь».

За зборнік «Ад сэрца» Купалу прысуджаецца Дзяржаўная прэмія. Гэта было 15 сакавіка 1941 года.

А праз тры месяцы пачалася вайна. Яна застала Купалу ў Каўнасе, дзе ён быў па запрашэнню літоўскіх пісьменнікаў. Паэт пакінуў Мінск. Ён едзе ў Маскву, потым у Клязьму, Казань... Былі гарачыя, палымяныя адозвы да народа, словы, поўныя нянавісці да ворага і веры ў перамогу, боль і туга па Радзіме — і заўчасная смерць вялікага, цудоўнага паэта зямлі беларускай.

Але паэт жыве і цяпер у сценах нашай «альма-матэр», сувязь яго з універсітэтам не парываецца. Пляяда выдатных беларускіх паэтаў—выхаванцаў філфака: Аўрамчык, Лойка, Гілевіч, Барадулін, Бураўкін і іншыя—з гонарам працягвае традыцыі бяссмяротнай паэзіі Янкі Купалы.

Не знікае ва універсітэце інтарэс да жыцця і творчасці паэта.

Першыя даследаванні універсітэцкіх вучоных пра Купалу з'явіліся недзе ў пачатку 30-х гадоў. Гэта былі працы Замоціна, Ларчанкі і некаторых іншых. У той складаны час, калі крытыка не заўсёды прымала Купалу, яны аднымі з першых правільна зразумелі, ацанілі і падтрымалі паэта.

Асабліва многа пісаў пра Купалу М. Р. Ларчанка. У яго артыкулах ідзе размова аб някрасаўскіх матывах у творчасці паэта, пра сатыру Купалы, пра народнасць і патрыятызм твораў паэта. Асабліва многа даследаванняў пра Купалу з'явілася ў пасляваенны перыяд.

Купалаўская творчасць — нязменная і невычэрпная тэма ў працах С. Х. Александровіча, старэйшага беларускага крытыка. У 1958 годзе ён абараняе кандыдацкую дысертацыю «Янка Купала — майстар мастацкага перакладу». Вялікае месца займае творчасць Купалы ў працах прафесара БДУ І. Я. Навуменкі. Ён піша артыкулы пра Купалу, у 1967 годзе — манаграфію «Янка Купала. Духоўны воблік героя». У 1967 годзе І. Я. Навуменка абараняе кандыдацкую дысертацыю па тэме «Канцэпцыя чалавека ў творчасці Купалы і Коласа». Пішуць пра Купалу выкладчыкі БДУ Д. Я. Бугаёў, І. Л. Парашкова, Н. С. Гілевіч, В. В. Казлова, В. П. Рагойша, А. А. Лойка і іншыя універсітэцкія даследчыкі. Многія працы прадстаўляюць прадаўжаць нам, цяперашнім студэнтам універсітэта, бо творчасць паэта, цудоўная і шматгранная, заўсёды будзе прыцягваць да сябе ўвагу.

**Т. ЧАБАН,**
**член гуртка гісторыі і тэорыі беларускай літаратуры.**



*Да юбілею народнага песняра Беларусі ўзводзіцца новы мемарыяльны комплекс.*

*Вязынка. Цяпер у доме, дзе нарадзіўся Янка Купала, ідзе рэканструкцыя.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



# У ВНУ КРАІНЫ

● Сваіх першых 35 выпускнікоў дае краіне ў гэтым годзе геалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

● Больш года працуе на гістарычным факультэце Варонежскага універсітэта «Школа маладога камуніста». Слухачы — маладыя камуністы і камсамольцы— знаёмяцца з гісторыяй партыі, яе праграмнымі дакументамі, творамі класікаў марксізму-ленінізму. Адны з апошніх заняткаў гэтай школы прайшлі на Варонежскім ордэна Леніна заводзе цяжкіх механічных прэсаў.

● У чэрвені ў Ленінградскім політэхнічным інстытуце прайшоў Усесаюзны семінар па прымяненню ЭЦВМ у гідраўлічных працэсах. У ім прынялі ўдзел 110 чалавек з розных гарадоў краіны.

● Нядаўна група студэнтаў-турыстаў Мардоўскага універсітэта прайшла па месцах славы Падмаскоўя. Студэнты пабывалі ў Маскве, Падольску, Сонечнагорску, Істры і іншых гарадах, пазнаёміліся з матэрыяламі і дакументамі мясцовых музеяў, наведалі магілы загінуўшых воінаў і помнікі Вялікай Айчыннай вайны, сустрэліся з удзельнікамі падзей, ураджэнцамі Мардовіі, адшукалі магілы пятнаццаці студэнтаў Мардоўскага педінстытута, загінуўшых пад Масквой.

● Мастацкі савет Харкаўскага універсітэта завяршыў фарміраванне агіткультбрыгад. Сёлета самадзейных артыстаў і лектараў ХДУ чакаюць на рачных флатыліях Лены, Обі, Іртыша, Енісея, Волгі, Каспія, упершыню прыслалі запрашэнні флатыліі Немана, Дуная, Арктыкі.

Усяго ў састаў 10 агітбрыгад увайшло 150 студэнтаў.

# ВАМ, ФІЗІКІ!

Александров, Л. Н. Кинетика образования и структуры твердых слоев. Новосибирск, «Наука», 1972.

Вопросы теории плазмы. Сборник статей. Вып. 6. М., Атомиздат, 1972.

Гольдман, А. Г. и Жолкевич, Г. А. Стимулированные токи и электролюминесценция. Киев, «Наукова думка», 1972.

Левшин, В. Л. и Левшин, Л. В. Люминесценция и ее применение. М., «Наука», 1972.

Некоторые свойства движения тел и управления ими. Под ред. И. А. Балаевой и А. М. Формальского. М., 1971.

Приходько, В. И. К кинетике слабонеоднородных состояний в системе типа «Жидкость-газ». Киев, 1972.

Сименог, И. В. Асимптотически точные решения для систем с сингулярными потенциалами. Киев, 1972.

Смирнов, Б. М. Физика слабоионизованного газа в задачах с решениями. Для физ. фак. ун-тов и физ-техн. фак. втузов). М., «Наука», 1972.

Степанов, Н. Ф. и Немухин, А. В. Лекции по аналитической механике. М., 1972.

Стоянова, И. Т. и Анаскин, И. Ф. Физические основы методов просвечивающей электронной микроскопии. М., «Наука», 1972.

*РЭПЛІКА*

# ТАЯМНІЧЫ САВЕТ

**Чаму таямнічы! Колькі ні спрабавала рэдакцыя даведацца, чым жа займаецца ва універсітэце савет маладых вучоных, так нічога і не дабілася. Прыходзіцца ў гэтым прызнацца. Не будзеш жа сцвярджаць, што савет на працягу года нічога не рабіў. Несправядліва, скажуць. Не можа быць, каб была створана арганізацыя з запраграміраваным беспрацоўем! І мы спачатку так думалі. Пайшлі да ўзначальваючага савет кандыдата хімічных навук Ігара Іванавіча Пакроўскага. Вельмі мілы чалавек. Ахвотна з намі пагутарыў, спаслаўся на скромныя вынікі дзейнасці савета, але ўсё ж паабяцаў напісаць хоць бы аб задачах і планах маладой універсітэцкай арганізацыі. Карэспандэнт пайшоў задаволены і стаў чакаць.**

**Прайшоў некаторы час, і ў рэдакцыі ўбачылі самога тав. Пакроўскага. Але прыйшоў ён без матэрыялу: не знайшоў аб чым напісаць. Ну, нічога, падумалі мы, чалавек сціплы, добрасумленны, пачакаем, пакуль савет поўнасцю разгорне сваю дзейнасць.**

**Прайшоў яшчэ месяц-два. Зноў рэдакцыя шле свайго карэспандэнта да тав. Пакроўскага, і зноў асечка. Няма аб чым расказаць... Выходзіць, бяздзейнічае савет!**

**Можа знойдуцца зацікаўленыя асобы, дапамогуць высветліць становішча і адкажуць рэдакцыі, што ж перашкаджае плённай дзейнасці савета маладых вучоных БДУ!**

*РАІМСЯ, МЯРКУЕМ, СПРАЧАЕМСЯ.*

# КЛЮЧ ДА ПРЫГОЖАГА

Адна з важных якасцей гарманічна развітай асобы — а ў цяперашні час стаіць задача выхавання менавіта такога чалавека — здольнасць адчуваць і разумець цудоўнае. Але яна не дадзена прыродай чалавеку, а набываецца ў працэсе выхавання. Як жа ідзе гэты працэс на факультэтах БДУ? Якое месца ў агульнай рабоце партыйнай і камсамольскай арганізацый, напрыклад, фізічнага факультэта, займаюць пытанні эстэтычнага выхавання? Мяркуючы па планах партбюро і камітэта камсамола — значнае. Гэта і работа клуба «Кругагляд», і тэматычныя гутаркі па пытаннях навукі, літаратуры, мастацтва, сацыялогіі, і мастацкае афармленне факультэта, і штомесячны выпуск насценных газет, і сходы студэнтаў у інтэрнаце па пытаннях этыкі і культуры паводзін. Убачым у планах культпаходы ў кіно, тэатры, канцэртныя залы, клопат аб развіцці мастацкай самадзейнасці, паездкі агітбрыгад у падшэфныя школы і воінскія часці, правядзенне вечароў адпачынку. Ёсць тут і клуб цікавых сустрэч. Намечана і абмеркаванне прачытаных кніг, і работа літаратурна-сцэнічнай групы, тэатра мініяцюр, вакальна-інструментальнага ансамбля, і рэгулярнае правядзенне палітінфармацый.

Адразу заўважым, што ў планах не ігнаруюцца актыўныя формы эстэтычнага выхавання. Але нам хочацца спыніцца на недахопах, каб гэта размова паслужыла іх выпраўленню.

Вядома, мастацтва з'яўляецца галоўным сродкам выхавання эстэтычнага густу. У камітэце камсамола толькі і змаглі ўспомніць сумесны з філалагічным факультэтам прагляд спектакля ў тэатры імя Я. Купалы «Залатая карэта» ды навагодні вечар, на якім будучыя фізікі пазнаёміліся з работай выпускнікоў БТМІ. Вось і ўсё. А чаму? Сакратар камітэта камсамола Г. Стакроцкі тлумачыць гэта тым, што часу ў студэнтаў няма, ды і мы, маўляў, выйшлі з гэтага ўзросту. Дзіўнае меркаванне.

Эстэтычнае выхаванне мае на мэце развіццё мастацкіх здольнасцей чалавека. І, як нельга лепш, падыходзіць да гэтай ролі мастацкая самадзейнасць. Аднак на агульнауніверсітэцкім аглядзе фізічны факультэт заняў перадапошняе месца. Талентаў няма? Сакратар камітэта камсамола і яго намеснік тлумачаць гэта тым, што студэнты ў асноўным цягнуцца да эстрады і неахвотна наведваюць іншыя гурткі. А нам здаецца, немалая віна ў гэтым камсамольскіх важакоў. Магчыма, трэба было наладзіць сустрэчы з удзельнікамі гурткоў, каб студэнты не толькі ведалі аб калектыве па чутках, але і паглядзелі яго работу. Карысць ад гэтага была б несумненнай.

Эстэтычнае выхаванне прадугледжвае таксама фарміраванне эстэтычнага густу. Аб якім жа гусце можа ісці размова, калі на вечары адпачынку фізікаў музычныя інструменты выдавалі неверагодныя гукі, якія цяжка назваць музыкай.

Мог бы добрую службу ў эстэтычным выхаванні студэнтаў адыграць КВЗ. Была спроба правесці КВЗ паміж патокамі. Прайшло чатыры сустрэчы ды адна з матэматыкамі. На гэтым добрая справа і заглухла.

Які ж вывад з усяго сказанага? Проста сакратару камітэта камсамола Г. Стакроцкаму і яго намесніку В. Таранчуку трэба пазбавіцца ад памылковай думкі, што ў асноўным эстэтычнае выхаванне адбываецца не ў сценах універсітэта, і не спасылацца на загружанасць студэнтаў. Плён жа работы і каштоўнасць чалавека ў сучасных умовах прама залежаць ад узроўню ўсебаковага і гарманічнага развіцця яго асобы.

**Л. ДУК,**
**М. БАХАНАВА,**
**студэнткі журфака.**





*НА ЗДЫМКАХ: (уверсе і справа) практычныя заняткі па заалогіі беспазваночных у студэнтаў-завочнікаў I курса аддзялення біялогіі, якія вядзе асістэнт У. І. Піскуноў; (унізе) пераддыпломная практыка ў студэнткі IV курса біяфака М. Івановіч.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



## НЕ ВЕРЫШ—ПРАВЕР

Начны матылёк залятае ў хату—да халоднага ветру.

Жукі лятаюць увечары—да добрага надвор'я.

Камары і машкара слупам—да добрага надвор'я.

Увечары моцна стракочуць конікі—да добрага надвор'я.

Машкара лезе ў твар—на дождж.

Мухі гудуць ажыўлена—да цяпла.

У мурашніку хады адкрыты і прыкметны бойкі рух мурашак на кучы—да добрага надвор'я.

Перад добрым надвор'ем мухі прачынаюцца на золку і пачынаюць гусці, перад сырым—сядзяць ціха на сценах

Каля жоўтай акацыі кружыцца шмат насякомых—чакай непагадзі.

Павук нерухомы сярод павуціння—да непагадзі.

### РЭПРУА — САМАЯ КАРОТКАЯ РАКА

Самая доўгая рака ў свеце — Місісіпі, гэта ведаюць усе школьнікі. Але калі ёсць самая доўгая рака, дык, натуральна, павінна існаваць і самая кароткая. Дзе яна знаходзіцца?

Грузінскія географы сцвярджаюць, што ў Гагры. Тут, недалёка ад санаторыя «Украіна», упадае ў мора рэчка Рэпруа. Выток яе ўсяго ў дваццаці метрах ад вусця. Рэпруа выбіваецца на паверхню магутным патокам з падземнай пячоры. Вада Рэпруа сцюдзёная, смачная і круглы год мае пастаянную тэмпературу — 10 градусаў. Таму Гагра — адзінае на ўсім узбярэжжы месца, дзе нават у летнюю спёку з кранаў цячэ халодная вада.

### ПАПЕРА З НАФТЫ

Як лічаць некаторыя эксперты па лесаводству, да 2000 года на зямным шары будзе адчувацца востры недахоп вырабаў з паперы.

У сувязі з гэтым у Японіі распрацоўваецца праект вырабу паперы з прадуктаў нафты.

Па выгляду сінтэтычная папера амаль не адрозніваецца ад сапраўднай. Яна больш моцная, устойлівая да вады і сырасці. Аднак сабекошт яе пакуль што вельмі высокі.

### ДРЭВЫ-ПОМНІКІ

Калі б дрэвы ўмелі размаўляць, дуб, што расце на сядзібе саўгаса «Глінцішкес» Вільнюскага раёна, шмат аб чым расказаў бы людзям. Па сцвярджэнню літоўскіх дэндролагаў, дуб — равеснік рымскага імператара Юлія Цэзара.

Двухтысячагадовы старажыл, аднак, — толькі малодшы брат другога зялёнага волата, які вырас ля пасёлка Стэльмужэ на граніцы з Латвіяй. Вучоныя не без падстаў называюць яго старэйшынай лясоў Еўропы.

Глінцішкескі і стэльмужскі дубы ў ліку больш 500 дрэў-старажылаў аб'яўлены ў Літве помнікамі прыроды і ўзяты пад ахову.

## КУТОК НАТУРАЛІСТА



# У БЯДЗЕ НЕ ПАКІНУЛІ

Многія ставяцца да вераб'я - задзіры неяк няўважліва. І дарэмна. Вераб'і не толькі карысныя, але і разумныя птушкі. І пацвярджэнняў гэтаму я сустракаў шмат. Раскажу толькі аб адным выпадку.

Неяк мінулым летам дзеці прынеслі аднекуль птушанё вераб'я. Выпаў, відаць, з гнязда, што было пад страхой. Вырашана было змясціць яго на балконе. Паставілі птушаняці вады, накрышылі хлеба. Аднак бедалага ні еў, ні піў. Толькі папіскваў. Што ні рабілі— не есць. Палі духам рабяты.

Раніцай мы прачнуліся раней звычайнага ад нейкага шуму: за акном на дрэве сядзела чародка вераб'ёў. Час ад часу які-небудзь са старых вараб'ёў зрываўся з дрэва і падлятаў да птушаняці, соваў яму ў рот муху. І так па чарзе, як толькі птушанё давала знаць, што прагаладалася.

Яшчэ некалькі дзён старыя вераб'і дзяжурылі каля свайго малодшага, трапіўшага ў бяду сабрата, кармілі да таго часу, пакуль ён не паляцеў. І што цікава, не забыў гэты верабейчык балкон, на якім яго выратавалі сабраты. І людзей, якія выратавалі яго, таксама доўга помніў, зрэдку залятаў нават у кватэру, не баяўся.

**С. ШКАДЗІНСКІ.**
**«Родная прырода», № 3.**

# ГУМАР



● *Без слоў.*



● *Вундэркінд.*

# СТУДЭНЦКІЯ ЎСМЕШКІ

*ПАЛІГЛОТЫ*

*— Мы з вамі гаворым на розных мовах! — сказаў выкладчык студэнту на заліку па матэматыцы.*

*КАРЫСНАЯ ПАРАДА*

*Збіраючыся на экзамен, пакладзіце пад пятку паўрубля. Што б ні здарылася, грошы вам заўсёды спатрэбяцца.*

*АБМЕН ДУМКАМІ*

*— Што вы думаеце аб выкладчыку К.? — спытаў другакурснік у дыпломніка.*

*— Я думаю, што ты не праў, — быў адказ.*

*НАТАТКІ ФІЛОЛАГА*

*— У бессмяротнай камедыі А. С. Грыбаедава «Гора ад розуму» косак 154, кропак — 99, двухкроп'яў — 26, астатніх знакаў прыпынку «на суму» 247.*

*СЛОВА САЦЫЁЛАГАМ*

*Прыкмечана, што сярэдні рост студэнтаў за апошні час павялічыўся на некалькі сантыметраў. Сацыёлагі тлумачаць гэта цягай да ведаў.*

* * *

*Студэнт Алег Т. перад экзаменам паведаміў сябрам:*

*— Чуе маё сэрца, схаплю «нездавальняюча...»*

*Прадказанне збылося з дакладнасцю да сотай бала.*

*ДЫЯЛОГ*

*— Ты ўжо здаў экзамен?*

*— Не, гэта я толькі так выглядаю.*

*Б. ПЯТРОЎ.*
*В. НАВАСЕЛЬЦАЎ.*

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 02820
Заказ 727.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз.